# З любоўю да роднай мовы

29.01.2021 00:00

**28 студзеня адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў лінгвістычнага конкурсу “Буслік-2020”**. Ён праводзіцца з 2004 года з мэтай развіцця і падтрымкі цікавасці школьнікаў да вывучэння беларускай мовы, літаратуры і мовазнаўства. Доўгачаканыя вынікі парадавалі многіх навучэнцаў гімназіі-каледжа. З 72 удзельнікаў у гэтым годзе 14 атрымалі прызы. У конкурсе няма прайграўшых. Незалежна ад выніку кожны ўдзельнік атрымлівае прыз "для ўсіх".

**Віншуем усіх нераўнадушных да лёсу роднай мовы і запрашаем паказаць свае веды па беларускай мове і літаратуры ў гэтым навучальным годзе, 18 лютага!**





